ЛІТАРАТУРА

*1. Taylor C.W.* Jhe Minnesota studies of creative thinking // Taylor C.W. (Ed) Widening horizons in creativity N.Y., 1964. *2. Osborn A.* Applied imagination. N.Y., 1957. *3. Lowenfeld V.* Creativity and Art Education // School Arts. Vol. 59. October, 1959. N 2. P. 5. *4. Fromm E.* Jhe creative attitude. In H. Anderson (Ed.), Creativity and its cultivation. N.Y. Harper and Kow, 1959. *5. Выготский Л.* Воображение и творчество в детском возрасте. М., 1991. *6. Lowenfeld V.* Jhe Adolesnes of Art Education // Art Education. Vol. 10. 1957. N 7. P. 8. *7. Аристотель.* Политика. М., 1911. С. 206—207. *8. Сухомлинский В.* О воспитании. М., 1973.

С.Б.МАЙСЕЙЧУК (МІК)

## ДА ПЫТАННЯ АБ СІСТЭМНЫМ ПАДЫХОДЗЕ ДА ТВОРЧАЙ АДОРАНАСЦІ ДЗЯЦЕЙ-ІНВАЛІДАЎ

Перад грамадствам на працягу ўсяго развіцця стаяла праблема ўзбагачэння інтэлектуальнага патэнцыялу. У цяперашні час педагогі і псіхолагі б'юць трывогу аб пагаршэнні творчага генафонду, звяртаюць асаблівую ўвагу на негатыўныя вынікі сацыяльнай практыкі, якая прыводзіць да нівеліравання індывідуальнасці дзіцяці. Гэта асабліва моцна праяўляецца ў практыцы школьнай адукацыі і выхавання. А між тым мэтанакіраванае фарміраванне здольнасцей ужо ў маленстве важнае не толькі для саміх дзяцей, іх развіцця, але, у першую чаргу, для грамадства ў цэлым, для будучыні. Для яго забеспячэння патрэбны глыбокае тэарэтычнае абгрунтаванне і распрацоўка спецыяльных методык, якія б засноўваліся на творчым вопыце настаўнікаў-наватараў і ўсебаковых сацыялагічных даследаваннях розных груп дзяцей і падлеткаў.

Да ліку найбольш складаных у нашай педагагічнай і псіхалагічнай літаратуры адносіцца праблема дыягностыкі адоранасці дзяцей дашкольнага і школьнага ўзросту. У некаторых выпадках пры вырашэнні гэтай праблемы выкарыстоўваюцца чыста колькасныя метады, розныя тэсты, без уліку біялагічных, псіхалагічных і іншых фактараў. Такі аднабаковы падыход стварае памылковае ўяўленне аб генезісе адоранасці і працэсе яе рэалізацыі. Ураўноўванне людзей па задатках і здольнасцях прыводзіць да фарміравання сярэдняга вучня, пазбаўляючы яго магчымасці праявіць сваю непаўторную індывідуальнасць.

Работа над стварэннем сістэмы выяўлення адоранасці дзяцей пачынаецца з фарміравання метадалагічных прынцыпаў. Нельга не пагадзіцца з меркаваннямі амерыканскіх вучоных, якія ставяць на першы план прынцып вызначэння найбольш ёмістага і практычнага паняцця адоранасці. У навуковай літаратуры існуе шмат падыходаў да вызначэння адоранасці, якія аднак, уключаюць аналіз адзінства індывідуальна-псіхалагічных рыс і навакольных умоў рознай складанасці. У той жа час намі прапаноўваецца сістэмны падыход у вывучэнні праблемы



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

адоранасці і стварэння на гэтай аснове дыфэрэнцыраваных праграм і методык навучання дзяцей у школе, пачынаючы з I класа.

Паводле нашага меркавання, у сістэмны падыход патрэбна ўключыць цэлы шэраг узаемазвязаных метадаў, якія б дазволілі ахапіць усю аб'ёмістасць і складанасць вывучэння праблемы адоранасці. Да гэтых метадаў неабходна аднесці: 1) генеалагічны (аналіз радаводу); 2) фізіялагічны (вывучэнне ўзаемадзеяння сігнальных сістэм); 3) псіхалагічны (наяўнасць назіральнасці, фантазіі і г.д.); 4) экалагічны (чысціня навакольнага асяроддзя, тэрытарыяльнасць і г.д.); 5) сацыялагічны (сямейнае выхаванне, уплыў мікраасяроддзя), а таксама іншыя метады.

Кожны з гэтых спосабаў мае пэўныя перавагі, дазваляе больш глыбока вывучаць той ці іншы бок шматграннасці творчых задаткаў. Аднак неабходна пазбягаць аднабаковага падыходу і абсалютызацыі таго ці іншага метаду, не супрацьпастаўляючы іх адзін аднаму.

Сукупнасць атрыманай інфармацыі дае магчымасць выявіць і вызначыць дамінанту ў фарміраванні і рэалізацыі адоранасці і з яе прызнаннем унесці карэктывы як у агульную адукацыйную праграму, так і ў рэкамендацыі розным калектывам, якія прама ці ўскосна звязаны з навучаннем і выхаваннем дзяцей. Гэта тым больш неабходна ажыццявіць пры вывучэнні праблем адоранасці інвалідаў дзіцячага ўзросту.

Праяўленнем найвышэйшага гуманізму грамадства з'яўляецца вяртанне ў творчы фонд той часткі адоранасці і унікальнасці індывіда, якая раней педагагічнымі ўстановамі па розных прычынах н заўважаліся ці проста ігнараваліся. Прырода, якая абышла дзяцей-інвалідаў у адным, часта дае «ўзамен» цудоўны музычны слых, артыстычнасць, талент мастака ці вынаходніка. Грамадства не мае права не заўважаць іх, інакш яно можа згубіць тысячы і тысячы таленавітых людзей. Для саміх гэтых людзей рэалізацыя рознабаковых здольнасцей, якія запатрабаваны грамадствам, з'яўляецца формай іх быцця, самасцвярджэння і адчування паўнацэннасці сваёй жыццядзейнасці, іншымі словамі, — адзіным сродкам іх сацыяльна-псіхалагічнай рэабілітацыі.

Для таго, каб запатрабаваная грамадствам рэалізацыя здольнасцей ажыццявілася, неабходна выявіць адораных дзяцей з абмежаванымі фізічнымі магчымасцямі і дапамагчы ім праявіць гэтую адоранасць у найбольшай ступені, а дзеля гэтага трэба звярнуцца да тых самых дыягнастычных метадаў, якія, аднак, маюць патрэбу ў карэкціроўцы з улікам асаблівасцей гэтай сацыяльнай групы дзяцей.

Прызнаючы важнасць адрозненняў псіхолага-фізіялагічных метадаў, не трэба забываць пра мікраасяроддзе, лакальныя сацыяльныя ўмовы. Дзіця-інвалід увесь свой час праводзіць у сям'і. Менавіта на яе кладзецца абавязак ранняга выяўлення і развіцця творчай адоранасці. Адзін з метадаў, якія трэба выкарыстаць, — назіранні і вядзенне дзённіка. Эфектыўнымі метадамі пошуку і дыягностыкі адоранасці інвалідаў

дзіцячага ўзросту могуць таксама стаць розныя завочныя формы інтэлектуальных і мастацкіх спаборніцтваў (алімпіяды, турніры і інш.).

Звяртае на сябе ўвагу тая актыўнасць, з якой вучоныя ўзяліся за ажыццяўленне праграмы «Творчая адоранасць». У верасні 1991 г. у Маскве адбылася канферэнцыя «Дыягнастычныя метады работы з адоранымі дзецьмі і моладдзю».

Вядомыя псіхолагі, педагогі-практыкі прапанавалі для абмеркавання наступныя праблемы: узаемасувязь сацыяльнага і прыроднага ў развіцці адораных дзяцей, прырода творчых здольнасцей, метады іх ранняй дыягностыкі, стварэнне навучальных устаноў ад ліцэя да малой Акадэміі навук. Удзельнікі канферэнцыі аднадушна адзначылі цяжкасці дыягностыкі ўзроставай адоранасці і прагнозу, ставілі пытанне аб неабходнасці змены парадыгмы ад дыягностыкі адбору да дыягностыкі развіцця.

У рэспубліцы таксама распрацоўваецца дзяржаўная праграма «Таленавітыя дзеці», якая будзе забяспечваць пошук, падтрымку і развіццё здольных, таленавітых дзяцей і моладзі. Ствараецца рэспубліканскі цэнтр па рабоце з таленавітымі дзецьмі незалежна ад іх фізічнага стану, мяркуецца выкарыстанне самых разнастайных метадаў па выяўленні іх адоранасці, у тым ліку і дзяцей з абмежаванымі фізічнымі здольнасцямі.

Дыягностыка адоранасці дзяцей-інвалідаў і наступнае на гэтай аснове фарміраванне тых ці іншых здольнасцей — комплексная задача. Яе вырашэнне патрабуе калектыўных намаганняў вучоных і педагогаў, сям'і і спецыяльных супольніцтваў, дзяржаўных органаў і дабрачынных арганізацый.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ